турной идентичности, закрепления культурного кода для определенной группы. Само понятие «опыт» в этом контексте включает в себя не только пережитое и усвоенное человеком из пласта реальности, но и не пережитое, а лишь потенциально возможное.

Сообщества по культурной доминанте обращаются к поискам «целостного человека», преодолению представлений о человеке как «гносеологическом субъекте» (В. Дильтей), возвращению подлинного бытия, к «самости Я» как источнику развития и построения действительно индивидуального, самобытного начала на путях творчества.

## ТРАДЫЦЫЙНЫЯ ФОРМЫ КУЛЬТУРНА-АДУКАЦЫЙНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ КРАЯЗНАЎЧЫХ МУЗЕЯЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ НА СУЧАСНЫМ ЭТАПЕ

***І. І. Бамбешка,***
*старшы выкладчык кафедры гісторыі Беларусі*
*і музеязнаўства Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта*
*культуры і мастацтваў*

Палітру культурнага жыцця любой краіны, у тым ліку і Беларусі, цяжка ўявіць без такой з’явы як музей. Па дадзеных афіцыйнай статыстыкі ў Рэспубліцы Беларусь у сістэме Міністэрства культуры функцыянуе 157 музеяў розных профіляў, сярод якіх 81 краязнаўчы (51,6 %) [5, с. 192]. Дамінуючая колькасць краязнаўчых музеяў абумоўлена, на наш погляд, тым, што краязнаўчы музей з’явіўся ўніверсальным і поліфункцыянальным інстытутам, пры дапамозе якога праз музейную экспазіцыю раскрываецца змест і спецыфіка сацыяльнага і культурнага жыцця кожнага канкрэтнага рэгіёна. Разам з тым поспех краязнаўчага музея ў выкананні сваіх сацыяльных функцый залежыць ад эфектыўнага развіцця ўсіх кірункаў яго дзейнасці: навукова-фондавай, экспазіцыйна-выставачнай і культурна-адукацыйнай. Культурна-адукацыйная дзейнасць музея – адзін з асноўных напрамкаў яго работы як у самым музеі, так

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

і па-за яго межамі. Змест культурна-адукацыйнай дзейнасці музея выяўляецца ў формах работы музея з аўдыторыяй.

Асноўнай формай культурна-адукацыйнай дзейнасці краязнаўчага музея з'яўляецца экскурсія. Краязнаўчыя музеі краіны прапануюць наведвальнікам цэлы шэраг разнастайных экскурсій: аглядных і тэматычных, для розных узроставых груп (у тым ліку і для сямейных наведвальнікаў), па месцы правядзення (музейныя экскурсіі, гарадскія, комплексныя) і г. д. Традыцыйныя экскурсіі ўсё часцей мадэрнізуюцца за кошт метадаў гульнявых, тэтралізацыі і г. д. Так, экскурсіі па літаратурным аддзеле Гродзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея (ГДГАМ) «Музей Максіма Багдановіча» праводзяць яго супрацоўніцы ў стылізаваным касцюме XIX ст. ад імя Марыі Апанасаўны Багдановіч (маці паэта). Наведвальнікі падчас экскурсіі гуляюць у свецкія гульні, распаўсюджаныя ў тыя часы [7]. Можна сказаць, што амаль кожны краязнаўчы музей практыкуе спалучэнне класічнай экскурсіі з інтэрактыўнай. У сувязі з гэтым у арсенале музеяў з'явіліся экскурсіі-гульні, экскурсіі-квэсты і г. д.

Таксама ў практыцы краязнаўчых музеяў атрымалі шырокае распаўсюджанне экскурсіі па-за межамі музеяў: да помнікаў і ў памятныя мясціны горада і раёна. Яны цікавыя не толькі для гасцей горада, але і для яго пастаянных жыхароў, якія з задавальненнем атрымліваюць новыя звесткі аб сваім родным горадзе. Тэматыка маршрутаў вельмі разнастайная. Можна вылучыць некалькі тыпаў: аглядныя гарадскія экскурсіі; маршруты да помнікаў гісторыка-культурнай спадчыны, размешчаных на тэрыторыі раёна, архітэктурныя, археалагічныя, ваенныя і этнаграфічныя маршруты з наведваннем месцаў з захаванымі ці адроджанымі традыцыямі [1, с. 15]. У гэтай сувязі вельмі цікавы вопыт Віцебскага абласнога краязнаўчага музея (ВАКМ), які не абмежаваўся традыцыйнымі пешаходнымі і аўтобуснымі экскурсіямі, а ў 2008 г. наладзіў новы экскурсійны маршрут «Трамвай і тралейбус выхаднога дня». У 2010–2011 гг. праводзілася экскурсія на параходзе па Заходняй Дзвіне [2, с. 59].

Пастаяннай формай работы краязнаўчых музеяў з наведвальнікамі па-ранейшаму застаецца музейная лекцыя. Яе спецыфіка ў тым, што, па-першае, на ёй абавязкова прысутнічае музейны

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прадмет (яўна ці ўскосна) і, па-другое, яна мае ярка акрэслены вучэбны характар. Аднак пад уплывам рознага роду фактараў і гэта форма адчула на сабе змены, звязаныя з тым, што падчас музейных лекцый даволі часта выкарыстоўваюцца не аўтэнтычныя музейныя прадметы, а іх электронныя выявы. На думку асобных айчынных даследчыкаў, такую тэндэнцыю нельга лічыць абсалютна негатыўнай, паколькі выкарыстанне электронных выяў музейных прадметаў павышае вобразнасць музейнай лекцыі, дазваляе прадставіць аўдыторыі значна больш музейных прадметаў і самае галоўнае – вырашаецца праблема захаванасці музейных прадметаў падчас лекцый і асабліва выязных мерапрыемстваў [4, с. 155]. Разам з тым актыўнае выкарыстанне электронных прэзентацый пазбаўляе музейную лекцыю яе галоўнай адметнасці – музейнасці. Аналіз лекцыйных практык беларускіх краязнаўчых музеяў паказаў, што музейныя лекцыі на тэмы профільных дысцыплін прапаноўваюцца ў кожным краязнаўчым музеі, іх колькасць вар'іруецца ад некалькіх адзінак да двух – двух з паловай дзясяткаў, як, напрыклад, у Магілёўскім абласным краязнаўчым музеі (МАКМ) [3]. У большасці сваёй у час лекцый выкарыстоваўваюцца арыгінальныя музейныя прадметы, за выключэннем тых момантаў, калі лекцыі праводзяцца за межамі музея.

Гаворачы аб музейных лекцыях, нельга не звярнуць увагу на цікавы, па-свойму ўнікальны вопыт Вілейскага краязнаўчага музея, які ў перыяд з лістапада 2011 г. па май 2012 г. рэалізаваў культурна-адукацыйны праект, прысвечаны сучаснаму беларускаму мастацтву «ART-VILEYKA». Сутнасць праекта заключалася ў тым, што ў выставачнай зале музея раз на месяц выступалі вядомыя мастацтвазнаўцы, скульптары, графікі, мастакі, арганізатары перформансаў. Падчас лекцый вялася размова аб сучасным візуальным мастацтве Беларусі (сучаснай фатаграфіі, жывапісе, перформансе, мультыплікацыі) у даступнай і адначасова цікавай для гледачоў форме. Спецыяльна з нагоды мерапрыемстваў была выпушчана серыя буклетаў, дзе змяшчалася ўся неабходная інфармацыя [6, с. 139–140].

Традыцыйнай, хоць і не вельмі распаўсюджанай формай культурна-адукацыйнай дзейнасці з'яўляецца кансультацыя па пытаннях, што цікавяць наведвальніка. Гэта практычна адзіная

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

форма, якая мае індывідуальны характар. Яна ніколі не была шырока распаўсюджана, але і не знікала з музея. У сувязі з павелічэннем у музеях індывідуальных наведвальнікаў, якія аглядаюць экспазіцыю без экскурсавода, такую форму можна лічыць вельмі перспектыўнай. Нягледзячы на тое, што ў нашых музеях кансультант у залах – дастаткова рэдкая з’ява, многія краязнаўчыя музеі сярод форм культурна-адукацыйнай дзейнасці згадваюць і яе. У асобных беларускіх краязнаўчых музеях яна існуе ў некалькі змененым выглядзе. Так, у Лідскім гісторыка-мастацкім музеі створаны комплекс краязнаўчых матэрыялаў у выглядзе вытрымак з перыядычнага друку, копій музейных прадметаў і г. д., якія аб’яднаны па пэўных тэмах. Кожны, хто мае патрэбу ў інфармацыі аб Лідзе, Лідчыне, можа карыстацца гэтымі матэрыяламі.

Навуковыя чытанні (канферэнцыі, сесіі, пасяджэнні) таксама адносяцца да ліку традыцыйных форм для многіх краязнаўчых музеяў. Сярод даследчыкаў і краязнаўцаў краіны папулярнасцю карыстаюцца тэматычныя навуковыя канферэнцыі, якія рэгулярна праводзяць ВАКМ, ГДГАМ, МАКМ, Лепельскі раённы краязнаўчы музей і інш. Падобныя навуковыя сустрэчы не толькі задавальняюць пазнавальныя інтарэсы грамадскасці, але і павышаюць прэстыж краязнаўчага музея як навукова-даследчай установы.

Пералічаныя формы прадугледжваюць галоўным чынам пасіўны ўдзел аўдыторыі. Аднак сярод традыцыйных форм сустракаюцца і накіраваныя на ўключэнне людзей у актыўную камунікацыю. Гэта клубы, гурткі, студыі. Актыўнасць аўдыторыі з’яўляецца іх агульнай прыкметай. Так, пры Чэрвеньскім раённым краязнаўчым музеі існуе краязнаўчы клуб «Бонда», пры Аб’яднаным краязнаўчым музеі аддзела культуры Мазырскага райвыканкама – аб’яднанне гістарычнай рэканструкцыі, пры Светлагорскім гісторыка-краязнаўчым музеі – сяброў музея, пры Гарадоцкім раённым краязнаўчым музеі – аматараў кветкаводства, адраджаюцца і студыі народных традыцый і г. д. Гэтыя арганізацыі аб’ядноўваюць людзей самых розных узростаў, агульных інтарэсаў, якія актыўна ўключаюцца ў працу музеяў, пашыраючы іх межы і магчымасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Паколькі асноўным спажыўцом музейных паслуг з'яўляюцца школьнікі, то музеі выкарыстоўваюць такую традыцыйную і папулярную форму, як віктарыны, конкурсы і алімпіяды.

Музейная алімпіяда шмат у чым адрозніваецца ад школьнай прадметнай перш за ўсё месцам правядзення, а таксама зместам конкурсных заданняў. Гэтыя спаборніцтвы арганізуюцца такім чынам, каб максімальна наблізіць наведвальнікаў да музейных калекцый: заданні прадугледжваюць не толькі веданне фактаў, але і экспазіцый, помнікаў, асобных відаў гістарычных крыніц. Яны садзейнічаюць уцягненню вучняў у прадметны свет гісторыі, дазваляюць дзецям больш шырока пазнаёміцца са спадчынай, стварыць вобраз канкрэтнага часу, адчуць яго хоць на некалькі хвілін. Сталі вядомыя традыцыйныя музейныя віктарыны і алімпіяды ў МАКМ, Лепельскім раённым краязнаўчым музеі, Салігорскім краязнаўчым музеі і інш.

Сярод традыцыйных форм культурна-адукацыйнай дзейнасці ёсць арыентаваныя пераважна на задавальненне патрэбы людзей у адпачынку, рэкрэацыі. Да іх можна аднесці сустрэчы з цікавым чалавекам. На наш погляд, звышвысокая цікавасць сённяшніх дзяцей і падлеткаў да віртуальных зносін актуалізуе такую форму, паколькі дае магчымасць непасрэднай размовы з незвычайнай асобай. Даволі часта гэтыя сустрэчы сумяшчаюцца з іншымі формамі: канцэртамі, вечарынамі, рознага роду імпрэзамі, тэатралізаванымі прадстаўленнямі, кінапраглядамі і г. д. Музейнымі такія формы становяцца тады, калі з іх дапамогай увасабляецца ідэя сінтэзу прадметнага музейнага асяроддзя і мастацтва. Усе яны ў той ці іншай ступені выкарыстоўваюцца краязнаўчымі музеямі Беларусі, аднак, як паказвае практыка, яны запатрабаваны нязначнай колькасцю пастаянных наведвальнікаў, сярод якіх пераважаюць работнікі культуры, адукацыі, творчая інтэлігенцыя. Асноўная задача падобных мерапрыемстваў – падтрыманне іміджу музея як захавальніка духоўнай спадчыны.

Такім чынам, мы акрэслілі традыцыйныя формы культурна-адукацыйнай дзейнасці краязнаўчых музеяў Рэспублікі Беларусь на сучасным этапе. Таксама вылучылі шэраг характарыстык, паводле якіх апісалі азначаныя формы. Агляд форм навукова-асветнай дзейнасці дапамог нам уявіць агульную карціну

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

культурна-адукацыйнай дзейнасці краязнаўчых музеяў. Формы работы музея з наведвальнікам, з аднаго боку, устойлівыя, а з другога – рухомыя, яны пастаянна ўдасканальваюцца, карэкціруюцца ў адпаведнасці з новымі сацыяльна-культурнымі рэаліямі.


1. *Блиц, В. Л.* Туристские возможности музеев Беларуси (аналитический обзор по материалам анкетирования) / В. Л. Блищ // Личность – слово – социум : материалы VII Междунар. науч.-практ. конф., Мінск, 11–12 апр. 2007 г. : в 3 ч. / отв. ред. Т. А. Фаламева. – Минск, 2007. – С. 14–17.

2. *Ісачанка, А. Л.* Абагульненне вопыту работы з наведвальнікамі ў Віцебскім абласным краязнаўчым музеі / А. Л. Ісачанка // Музейная адукацыя і музейная справа ў Рэспубліцы Беларусь: стан, тэндэнцыі, перспектывы : матэрыялы рэспубл. навук.-практ. канф., 24 ліст. 2011 г. / Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў ; рэдкал.: М. А. Бяспалая (старш.) [і інш.]. – Мінск, 2012. – С. 55–60.

3. Лекцыі [Электронны рэсурс] // Магілёўскі абласны краязнаўчы музей. – Рэжым доступу: http://mogilewmuseum.by/lekcyi/shkolnk-syaryednh-klasa. – Дата доступу: 01.04.2017.

4. *Лупашка, І. Г.* Асноўныя тэндэнцыі культурна-адукацыйнай дзейнасці беларускіх літаратурных музеяў на сучасным этапе / І. Г. Лупашка // Весн. Беларус. дзярж. ун-та культуры і мастацтваў. – 2011. – № 1 (15). – С. 154–160.

5. Статистический ежегодник Республики Беларусь, 2016 г. // Национальный статистический комитет Республики Беларусь. – Минск : НСК РБ, 2016. – 519 с.

6. *Сушко, Е. И.* Потенциал современных лекционных практик в музее (на примере культурно-образовательного проекта «ART-VILEYKA») / Е. И. Сушко // Первый Национальный форум «Музеи Беларуси» : сб. материалов деловой программы (Гродно, 12–14 окт. 2012 г.) / сост., ред. И. Б. Лаптенок. – Минск, 2013. – С. 138–140.

7. Тэатралізаваная экскурсія «Марыя Апанасаўна запрашае» (Музей Максіма Багдановіча) [Электронны рэсурс] // Гродзенскі дзяржаўны гісторыка-археалагічны музей. – Рэжым доступу: http://museum-grodno.by/pages/teatralzavanaya-ekskursya.html. – Дата доступу: 01.09.2016.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ